**Заключение.** Рекламный текст – это своего рода посредник между отправителем и потребителем. Многообразие форм рекламной коммуникации определяется значительным количеством критериев, которые положены в основу её классификации. Преобладание того или иного критерия зависит от задач, на решение которых направлена деятельность рекламодателя. Коммуникативная функция рекламы реализуется в создании текста для конкретной целевой аудитории. Разные виды рекламы имеют свои требования и особенности создания текстовой составляющей. Реклама составляет сферу общественных связей и отношений в качестве вида деятельности, а рекламный текст благодаря своим особенностям представляет особый интерес для изучения, в котором прикладное значение имеет анализ лингвистического наполнения текста рекламы в зависимости от её вида.

1. Бернадская, Ю.С. Текст в рекламе: учеб. пособие для вузов / Ю.С. Бернадская. – М.: ЮНИТИ-ДАНА, 2008. – 288 с.
2. Джоэл Джей, Д. Исследования в рекламной деятельности. Теория и практика / Д. Джоэл Джей ; [пер. с англ. Е. В. Кушнеренко, О. А. Полищук]. – М. : Вильямс, 2003. – 858 с.
3. Хромов, Л.Н. Рекламная деятельность: искусство, теория, практика / Л.Н. Хромов. – Петрозаводск, 1994. – 308 с.

## МІКРАТАПОНІМЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ: СЕМАНТЫЧНЫ АСПЕКТ

***Зуй К.В.,***
*студэнтка 4-га курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік –* ***Семянькова Г.К.,*** *канд. філал. навук, дацэнт*

Апошнім часам значная колькасць навуковых даследаванняў прысвечана пытанням анамастыкі, у тым ліку тапанімікі. Пры гэтым аб’ектам увагі нярэдка становяцца мікратапанімічныя адзінкі, што, як вядома, бытуюць у вуснай форме, таму не фіксуюцца ў дакументах і не маюць статусу афіцыйнага наймення. Носьбітамі такіх назваў выступаюць мясцовыя жыхары.

З цягам часу мікратапонімы забываюцца, страчваюцца па меры таго, як знікаюць людзі, што імі карысталіся. Праведзенае намі даследаванне можа паслужыць крыніцай каштоўнага матэрыялу і быць карысным пры далейшым вывучэнні мікратапаніміі. У сувязі са сказаным актуальнасць прапанаванага артыкула ўяўляецца відавочнай. Мэта – выяўленне і аналіз семантычных асаблівасцяў сучасных мікратапанімічных адзінак, што бытуюць на тэрыторыі Віцебскай вобласці.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне праводзілася на аснове фактычнага матэрыялу, сабранага ў вёсках Баталі, Вышадкі, Дуброва (Гарадоцкі раён), Абруб Беразвецкі, Бортнікі, Валодзькава, Галубчыкі, Леснікі, Мікуліна, Сарокі (Глыбоцкі раён), Пушкі (Лёзненскі раён), Марцюхова (Талачынскі раён), Варонка, Пашкі, Таўкіні (Шаркаўшчынскі раён), аграгарадках Гараны (Полацкі раён), Бабічы (Глыбоцкі раён) Віцебскай вобласці. Асноўнымі метадамі даследавання з’яўляюцца апісальны метад і метад сістэмнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Мікратапанімічныя назвы ўзнікаюць і замацоўваюцца ў сувязі з рознымі фактарамі гістарычнага, геаграфічнага, этнаграфічнага, сацыяльнага характару. Абапіраючыся на даследаванні іншых навукоўцаў [1], мы вылучылі наступныя семантычныя групы мікратапанімічных адзінак, што бытуюць на тэрыторыі Віцебшчыны: найменні, суадносныя з паняццямі “чалавек” і “жывая істота”; адзінкі, матываваныя прыродна-геаграфічнымі асаблівасцямі аб’екта; назвы, якія суадносяцца з лакалізацыяй аб’екта ў прасторы; найменні, што апісваюць асаблівасці ранейшага размяшчэння аб’екта; адзінкі, суадносныя з характарыстыкай аб’екта. Ніжэй спынімся на аналізе кожнай з названых груп.

Мікратапонімы, суадносныя з паняццямі “чалавек” і “жывая істота”, матывуюцца антрапонімамі (уласнымі асабовымі імёнамі, прозвішчамі, мянушкамі), назвамі прафесій і роду заняткаў, сацыяльнага статусу. Такія найменні паходзяць ад імён уладальнікаў і заснавальнікаў мясцін або тых, хто меў хоць нейкае дачыненне да гэтай мясцовасці: Андрэеўшчына – урочышча, дзе раней знаходзіўся маёнтак пана Андрэя; Балбекі – назва

часткі вёскі, дзе жылі жыхары з прозвішчам Балбекі; Башкіраўскі Ручай – месца, дзе раней жыў чалавек з прозвішчам Башкіраў; Глінішча – поле, на якім раней быў хутар Глінскіх; Карчэўскія – поле за вёскай, дзе стаяў хутар Карчэўскіх; Рахмусіха – поле, на месцы якога жыў чалавек з мянушкай Рахмусь.

Да гэтай жа групы належаць мікратапонімы, што ўзніклі ад назваў асоб па родзе заняткаў: Дзехцяроўка – месца ў вёсцы, дзе жыў дзягцяр (чалавек, што гнаў або прадаваў дзёгаць), Катляроўка – месца, дзе жыў катляр (вырабляў катлы ці іншыя металічныя прылады), Шаўчыха – поле, дзе раней была хата швачкі.

Да мікратапонімаў, матываваных прыродна-геаграфічнымі асаблівасцямі аб'екта, належаць адзінкі, значэнне якіх вынікае з апелятыўных назваў, што апісваюць блізкае размяшчэнне водных аб'ектаў, лясных і садовых масіваў, расліннасць, асаблівасці рэльефу. Паходжанне вялікай колькасці мікратапонімаў звязана з выразнай асаблівасцю, характэрнай для ландшафту Беларусі, – лясістасцю. Таму дастаткова шырока прадстаўлены мікратапонімы, семантыка якіх звязана з паняццямі "бор", "лес", "дрэва", "хвоя", "дуб": Баравінка – лес, назва якога паходзіць ад слова бор, Дубкі – месца, дзе раней была дуброва, К Дубу – месца, дзе расце вялікі стары дуб, Ліпаўшчына – поле, дзе раней быў хутар з вялікімі ліпамі, Тры Сасны – поле каля возера з трыма вялікімі соснамі.

Група мікратапонімаў, якая суадносіцца з лакалізацыяй у прасторы, самая нешматлікая ў нашым матэрыяле. Такія назвы звязаны з асаблівасцямі месцазнаходжання аб'екта адносна іншых аб'етаў у прасторы: Бабітошкі – месца паміж вёскамі Бабічы і Матошкі, Камышы – скарочаны шлях праз чарот, Плаціннік – лес каля плаціны.

Мікратапонімы, матываваныя назвамі, што апісваюць асаблівасці былога размяшчэння аб'екта, захавалі памяць пра тое, якія аб'екты знаходзіліся на гэтым месцы раней. Прадмета, які семантызаваў мікратапонім, даўно няма, аднак яго назва захоўваецца і добра зразумела мясцовым жыхарам: Асфальтоўка – месца, дзе раней клалі асфальт, Бочкі – месца, дзе раней пры калгасе стаялі бочкі з вадой, Газоўня – месца ў вёсцы, дзе запраўлялі газавыя балоны, Галодны Могільнік – месца пахаваных, што памерлі ў галадамор, Карчы – месца каля лесу, якое было выкарчавана штучна.

Да мікратапонімаў, суадносных з характарыстыкай аб'екта, належаць адзінкі, семантыка якіх звязана з характарыстыкай аб'екта паводле памеру, формы, іншых знешніх прыкмет: Варонка – канава ў лесе, дзе падчас Вялікай Айчыннай вайны ўзарвалася бомба, Вялікая – сажалка, якая лічыцца ў вёсцы самай вялікай, Казырок – поле, назва якога паходзіць ад часткі яго, што выступае над ракой, Трыўгольная – сажалка з адпаведнай формай, Тундра – самае вялікае ў акрузе поле, якое асацыюецца з такой прыроднай зонай, як тундра.

**Заключэнне.** Прааналізаваўшы асаблівасці мікратапанімічных адзінак Віцебшчыны паводле семантыкі, раскласіфікаваўшы іх на асобныя групы, мы можам зрабіць выснову, што самым распаўсюджаным шляхам матывацыі мікратапонімаў з'яўляецца суаднясенне адзінак з паняцем "чалавек" ці "жывая істота". Звязана гэта, верагодна, з наступным: канкрэтнае месца належала канкрэтнаму чалавеку ці сям'і, і назваць месца па прозвішчы ўладальніка – вельмі ўдалы варыянт для хуткага запамінання і добрай арыентацыі жыхароў населенага пункта.

Вельмі часта мікратапанімічныя назвы матывуюцца прыродна-геаграфічнымі асаблівасцямі аб'екта – асаблівасцямі рэльефу, блізкім знаходжаннем водных, лясных і садовых масіваў. Менш прадуктыўнымі з'яўляюцца спосабы матывацыі праз лакалізацыю аб'екта ў прасторы, былое размяшчэнне аб'екта, праз якасныя характарыстыкі самога аб'екта.

1. Адамовіч, Я.М. Мікратапанімічныя назвы / Я.М. Адамовіч. – Мінск: Вышэйшая школа, 1971. – 112 с.
2. Ономастика Беларуси. Топонимия: учебник / А.М. Мезенко [и др.]; под ред. А.М. Мезенко. – Минск: РИВШ, 2018. – 320 с.

Репозиторий ВГУ